# Спачатку было СЛОВА...


БЕЛТА

**Дзень беларускага пісьменства — унікальнае свята. Яно адзначаецца на дзяржаўным узроўні і кожны год — у новым месцы. У гэты раз яно супала з Годам кнігі і юбілеямі класікаў — Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка. Сёлета аматараў літаратуры сабраў горад Глыбокае, што ў самым сэрцы Віцебшчыны, паміж Нараччу і Браслаўскімі азёрамі, на вядомым яшчэ з Сярэднявечча шляху са старажытнага Полацка ў старадаўнюю Вільню**

Навукоўцамі, супрацоўнікамі Міністэрства інфармацыі кожны год выбіраецца новы горад, дзе пройдуць урачыстасці, прысвечаныя роднаму слову. Праходзяць яны ў пачатку верасня невыпадкова — так увекавечваецца час, калі Францыск Скарына выдаў першую кнігу на беларускай мове. Было гэта ў 1517 годзе на мяжы лета і восені ў Празе. Акрамя таго, Дзень пісьменства супадае з пачаткам новага навучальнага года. Алег Праляскоўскі, міністр інфармацыі, падкрэслівае значэнне свята:

— Адукацыя, інфармацыя і культура — тры галіны, якія фарміруюць інтэлектуальную эліту нацыі, яе сучаснасць і будучыню. У гэты дзень мы аддаем даніну павагі нашым

продкам, якія стварылі падмурак беларускай адукацыі і пісьменства.

У розныя гады святкаванні праходзілі ў Полацку, Тураве, Навагрудку, Нясвіжы, Оршы, Пінску, Заслаўі, Мсціславе, Міры, Камянцы, Паставах, Шклове, Барысаве, Смаргоні, Хойніках, Ганцавічах.

У любым мястэчку ці горадзе Беларусі абавязкова нарадзіліся знакамітыя людзі, якія ўнеслі ўклад у развіццё не толькі нацыянальнага пісьменства і наогул асветы, але і сталі выбітнымі асобамі ў сусветным маштабе. У Глыбокім такіх вялікіх людзей было асабліва шмат.

Нездарма на плошчы 17 Верасня, якая носіць сваю назву ў гонар уз'яднання беларускіх земляў у 1939 годзе, з'явілася незвычайная алея — яна ўпрыгожана бюстамі ўраджэнцаў Глыбокага і наваколляў. Кожны з тых, каму прысвечаны манумент, у чымсьці змяніў ход гісторыі:

- ***Язэп Драздовіч — мастак, які маляваў Марс яшчэ да таго, як планету сфатаграфавалі з першага запушчанага на яе спадарожніка,***
- ***Ігнат Буйніцкі — заснавальнік беларускага нацыянальнага тэатра,***
- ***Павел Сухі — авіяканструктар, вынаходнік самалёта "Су",***
- ***акадэмік Вацлаў Ластоўскі — адзін з першых прэм'ер-міністраў Беларусі, першы дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея,***
- ***Эліэзер Бен-Іехуда (Перальман) — стваральнік літаратурнага варыянта іўрыта.***

Дзень пісьменства пачаўся Божай літургіяй у глыбоцкім кафедральным саборы Раства Прасвятой Багародзіцы. Сюды прыехалі пісьменнікі, святары, навукоўцы — удзельнікі навукова-асветніцкай экспедыцыі "Дарога да святыняў". Яны праехалі з непагаснай лампадай ад Труны Гасподняй праз усю краіну. Намеснік упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Уладзімір Ламека звязвае духоўныя традыцыі і пісьменства разам:

— Асветнікі Кірыл і Мяфодзій прынеслі славянам пісьмо разам са Святым Пісаннем. Значыць, у аснове нашага пісьменства — Божае Слова.

Пасля літургіі на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы Глыбокага ўзнагароджвалі пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор 2012 года. Гучалі мелодыі ў выкананні Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору. Для дзяцей арганізавалі пленэр імя Язэпа Драздовіча. Старадрукаваныя рарытэты прывёз Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. А галоўнай падзеяй свята стаў маштабны фестываль кнігі і прэсы. На ім быў прадстаўлены і часопіс "Беларусь", які прыемна здзівіў сваім разнамоўем замежных гасцей. Між іншым, у Дні пісьменства ўзялі ўдзел больш за 100 пісьменнікаў не толькі з Беларусі, але і з Расіі, Украіны, Азербайджана, Таджыкістана, Сербіі, Чарнагорыі, Туркменістана.

Кульмінацыяй свята стала прэзентацыя перавыдадзенага ў Мінску "Буквара" 1767 года. Гэтая кніга ўпершыню выйшла ў Вільні. Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі звярнуў увагу на ўнікальнасць выдання:

— "Буквар" захаваўся ў свеце ўсяго ў 2 асобніках. У кнізе ёсць не толькі матэрыялы для навучання дзяцей грамаце, але і комплекс тэкстаў павучальнага характару: настаўленні, малітвы, павучанні і гімны. Яна перавыдадзена ў камплекце з гісторыка-культурным нарысам на беларускай, рускай і англійскай мовах, які раскрывае значэнне "Буквара" ў гісторыі кніжнай культуры Еўропы.

Аляксандр Каваленя, акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук, лічыць, што такое выданне павінна быць сёння ў кожнай школе:

— Каб дзеці маглі дакрануцца да вытокаў нашай гісторыка-культурнай, моўнай спадчыны.

За час свайго існавання Дзень беларускага пісьменства стаў па-сапраўднаму нацыянальным святам, значнай падзеяй культурнага жыцця краіны. І сёння святочныя мерапрыемствы прайшлі не толькі ў Глыбокім, але і па ўсёй Беларусі. Гэта былі тэматычныя ўрокі, лекцыі, семінары, творчыя сустрэчы з навукоўцамі, пісьменнікамі, дзеячамі культуры.

Наступны Дзень беларускага пісьменства ў 2013 годзе сустрэне Быхаў. А Глыбокае чакае гасцей у 2014-м на свой круглы юбілей — 500-годдзе з дня першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах.

Віктар **Андрэеў**



Стэнды с кнігамі заўсёды прыцягальныя і для моладзі